ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1980 г.
4
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 33 (1297)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## Сэрцам успрынялі, справай адкажам!

XXVI Насустрач з'езду

АПУБЛІКАВАНЫ ПРАЕКТ ЦК КПСС ДА XXVI З'ЕЗДА ПАРТЫІ «АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ЭКАНАМІЧНАГА І САЦЫЯЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ СССР НА 1981—1985 ГАДЫ І НА ПЕРЫЯД ДА 1990 ГОДА». У СТУДЭНЦКІХ АЎДЫТОРЫЯХ І НАВУКОВЫХ ЛАБАРАТОРЫЯХ, НА КАФЕДРАХ І ФАКУЛЬТЭТАХ ПАЧАЛОСЯ АБМЕРКАВАННЕ ГЭТАГА ДАКУМЕНТА. У РЭДАКЦЫЮ ПАСТУПІЛІ ПЕРШЫЯ ДОПІСЫ З 25-ТЫСЯЧНАГА КАЛЕКТЫВУ УНІВЕРСІТЭТА.

### РАДЗІМА ПАКЛАПАЦІЛАСЯ

Праект ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981 — 1985 гады і на перыяд да 1990 года» — новае яскравае сведчанне клопату нашай роднай Камуністычнай партыі аб росце дабрабыту народа.

Паглядзіце: за гады дзесятай пяцігодкі вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы падрыхтавалі 10 мільёнаў спецыялістаў. У гэты перыяд я таксама атрымаў вышэйшую адукацыю. За час навучання мне выплачвалі стыпендыю, забяспечвалі інтэрнатам. Заняткі вялі выкладчыкі высокай кваліфікацыі ў аснашчаных па апошняму слову навукі і тэхнікі лабараторыях. Радзіма паклапацілася і аб прадастаўленні мне работы. Вось яно — праяўленне намаганняў КПСС аб росце дабрабыту кожнага з нас і ўсёй краіны ў цэлым.

**В. БЯЛЯЕЎ,**
**намеснік старшыні прафкома універсітэта.**

### УВАГА ДА КОЖНАГА

Напэўна, не толькі мяне, але і многіх узрадавалі радкі з праекта аб неабходнасці ўсямернага паляпшэння ўмоў працы і быту работнікаў, аб стварэнні творчай абстаноўкі і здаровага клімату ў кожным калектыве. Гэта і зразумела: увесь працоўны дзень чалавек знаходзіцца не адзін, навокал яго сябры, калегі. І каб работа была цікавай не толькі як справа, а і як магчымасць зносін з аднадумцамі, магчымасць у творчай атмасферы павышаць сваё прафесійнае майстэрства, трэба зрабіць усё неабходнае для гэтага.

На XI пяцігодку прадугледжваецца далейшае паляпшэнне быту людзей, задавальненне культурных патрэбнасцей—ці ж гэта не стымул для ўдасканалення працы, магчымасць поўнага раскрыцця і праяўлення сваіх здольнасцей! Усе мы добра разумеем гэта і таму падтрымліваем імкненне зрабіць наша жыццё лепшым, разнастайным, радасным.

**А. СІНКЕВІЧ,**
**загадчыца аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна.**

### Вучыцца па-ленінску

Кожны радок гэтага гістарычнага дакумента прасякнуты шчырымі бацькоўскімі клопатамі аб павышэнні дабрабыту савецкіх людзей.

Нам, студэнтам універсітэта, будучым маладым спецыялістам, выпадзе пачэсны абавязак — адказваць на словы партыі канкрэтнымі справамі. Таму ўжо сёння ў аўдыторыях і чытальных залах, у лабараторыях і лінгафонных кабінетах неабходна паглыбляць свае веды, павышаць ідэйна-тэарэтычны ўзровень, выхоўваць у сабе чалавека новага грамадства. Вучыцца па-ленінску, па-камуністычнаму.

**А. ЛАЗОЎСКІ,**
**студэнт журфака.**

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
· Учора · Сёння · Заўтра ·

### СТАЛІ ТРАДЫЦЫЙНЫМІ

экскурсіі выхаднога дня ў Брэсцкую крэпасць-герой. Пуцёўкамі ўзнагароджана ўжо 300 чалавек — пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва на лепшую вучэбную групу. У бліжэйшы час зробяць экскурсіі яшчэ 2 групы — студэнты механіка-матэматычнага і фізічнага факультэтаў, якія перамаглі ў спаборніцтве на лепшы сельгасатрад.

**Б. ВАЛЯНЦІНАЎ.**

### ШМАТ ЦІКАВЫХ

мерапрыемстваў праводзіцца культурна-масавай камісіяй прафкома універсітэта. Нядаўна сумесна з праўленнем студэнцкага клуба была арганізавана творчая сустрэча з аўтарамі фільма «Восьмы дзень стварэння» па «Марсіянскай хроніцы» Брэдберы. Аб кінастужцы, рабоце над ёй расказаў прысутным аператар А. Мелкунян. З цікавасцю прагледзелі студэнты і кінастужку — дэбют маладога рэжысёра кінастудыі «Арменфільм» А. Бабаяна, мастацкім кіраўніком якога пры стварэнні фільма быў Мікіта Міхалкоў.

Заўтра ў актавай зале універсітэта артысты тэатра музычнай камедыі БССР пазнаёмяць студэнтаў са сваім спектаклем.

**Л. БАРАНОЎСКАЯ,**
**інструктар студэнцкага клуба.**

### ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

VIII Усесаюзнага конкурсу па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. Сярод лаўрэатаў — І. Аўрамава, Н. Валасюк, Л. Класкоўская (журфак), Р. Дзірке, І. Велічанскі, Л. Свярдлоў (гістфак), Нгуен Куонг Тханг і Ле Туан Хаа (мехмат), В. Талашкевіч (факультэт радыёфізікі і электронікі). У гэтым месяцы яны сустрэнуцца на І Усесаюзным злёце пераможцаў конкурсу, які адбудзецца ў Ленінградзе.

**А. РУБАНАЎ.**

### АМАТАРАЎ ПАЭЗІІ

на факультэце журналістыкі сабраў вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння А. Блока. Прагучала літаратурна-музычная кампазіцыя, якую падрыхтавалі студэнты III курса. Чыталі рабяты і апошнія пісьмы Блока, усхваляваныя радкі «Скіфаў»...

**С. ГУК.**

## Клопаты кожнага дня

ФОТАРЭПАРТАЖ

МАСКОЎСКАЯ, 17. Сціплая шыльда пры ўваходзе: «Юрыдычны факультэт БДУ імя У. І. Леніна».

Ён сустрэў нас цішынёй паверхаў. Ішлі сваёй чаргой заняткі. Пісаліся лекцыі ў аўдыторыях, разгортваліся спрэчкі і дыскусіі на практычных занятках, разгадваліся тайны... Звычайны дзень факультэта. У годзе такіх — сотні. Аднак згодзімся, што кожны з іх па-свойму ўсё ж адметны. Урэшце да гэтага імкнуцца ў камітэце камсамола факультэта. Каб кожны дзень быў напоўнены не толькі лекцыямі, практычнымі заняткамі, але і грамадскай актыўнасцю.

Сёння ў камітэце камсамола абмяркоўваецца план падрыхтоўкі да правядзення грамадска-палітычнай практыкі. Сакратар А. Войцік толькі што вярнуўся з пленума камітэта камсамола універсітэта. Ёсць аб чым падзяліцца з Наташай Анішчанка, камсоргам IV групы першага курса, з Валянцінам Шландыкавым, сваім намеснікам, і Міхаілам Міхалапам, членам камітэта камсамола. Дарэчы, заўважым, камсамольская арганізацыя факультэта — адна з лепшых ва універсітэце. За мінулы вучэбны год — чацвёртае месца ў сацыялістычным спаборніцтве сярод факультэтаў. Аднак хіба работа вядзецца толькі дзеля атрымання месца? Безумоўна, не.

Штаб працоўных спраў не адкладвае свае клопаты на вясну. Падрыхтоўка да працоўнага семестра-81 ідзе ўжо зараз. Абмяркоўваюцца месцы будучай дыслакацыі атрадаў, кандыдатуры камісараў і камандзіраў. А за гэта лета СБА юрыдычнага факультэта асвоена 754,2 тысячы рублёў капі-

(Працяг на 2-й стар.).



● ТОЛЬКІ ФАКТ

### Пошук талентаў працягваецца

І зноў вялікая зала інтэрната № 7 сабрала студэнтаў на традыцыйны агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці першакурснікаў мехмата.

Праграма кожнай групы вызначалася сваёй непаўторнасцю. Таленты раскрываліся ўсебакова: зала апладзіравала спевакам, танцорам, музыкантам. Больш за ўсё мехмату пашанцавала на дзяўчат-гітарыстак.

Амаль кожная група выступіла з нумарам мастацкай самадзейнасці на тэму студэнцкай сесіі. Але выканаўцы былі арыгінальнымі ў падыходзе да гэтай тэмы.

Журы і гледачы з вялікім захапленнем слухалі песню «Ивушка» ў выкананні в'етнамскай студэнткі Май Тхі Тху. Весела, з гумарам быў паказаны гледачам урывак з аперэты «Вяселле ў Малінаўцы»...

Агляд завяршыўся добрымі пажаданнямі, таварыскім поціскам рук. Пераможцамі сталі 6, 8 і 11 групы. Пошук талентаў працягваецца.

**І. ЦАЛУЙКА,**
**студэнтка журфака.**

КАЛЕКТЫЎ: ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ

# Калі ёсць агульная мэта

Усе матэматыкі ведаюць, што часам цяжка сфарміраваць групу з зададзенымі якасцямі. Групы — важная і адказная частка работы матэматыкаў. Але побач з абстрактнымі групамі існуюць і іншыя. Я маю на ўвазе студэнцкую акадэмічную групу.

Прынята лічыць, што група фарміруецца на першым курсе. Лідэры яе нярэдка вызначаюцца яшчэ на падрыхтоўчым аддзяленні. Потым — «бульба», баявое хрышчэнне першакурснікаў у сумеснай працы, якая ў многім дапамагае і студэнтам, і куратару даведацца, хто чаго варты.

Да канца другога курса акадэмічныя групы склаліся, з'ядналіся, у іх вызначыўся актыў.

Пачынаецца трэці курс, і тут з цяжкасцю ўзведзеная пабудова рушыцца. Групы распадаюцца. Дакладней, іх расфарміроўваюць, каб стварыць новыя — з арыентацыяй на кафедры. Так адбываецца амаль на ўсіх факультэтах, і на нашым мехмаце у тым ліку. Мера гэта, відаць, непазбежная, бо іменна з трэцяга курса пачынаецца спецыялізацыя студэнтаў. Пры гэтым рвуцца сувязі, якія склаліся ўнутры акадэмічных груп. Людзі, якія два гады запар спасцігалі тайны матэматыкі, разам былі на сельгасработах і ў будатрадах, разам праводзілі вольны час, цяпер часта толькі вітаюцца і перакідваюцца некалькімі словамі. Зразумела, дружба, глыбокая і моцная, не слабее ад таго, што сябры аказваюцца ў розных групах. Але тыя сувязі, якія аб'ядналі ў калектыў не два-тры чалавекі, а дваццаць-трыццаць, распадаюцца.

Узнікла новая група. Яе аб'ядноўвае зараз, галоўным чынам, цікавасць да пэўнай галіны матэматыкі. (Гэта — па ідэі!). Аднак далёка не ўсе студэнты да канца другога курса дакладна вызначылі свае навуковыя інтарэсы. Таму ідуць на першую трапіўшую ім кафедру. Як жа сфарміраваць калектыў з гэтых «рознанакіраваных» людзей? Як стварыць таварыскую атмасферу, дапамагчы кожнаму знайсці сябе ў выбраным напрамку матэматыкі?..

Там, дзе гэтыя праблемы вырашаны,— і паспяховасць лепшая, і грамадская актыўнасць вышэй; і наогул у такой групе цікавей жыць. Яе доўга будзеш успамінаць. Яна будзе прыкладам адносін з людзьмі.

Хто ж стварае ці дапамагае стварэнню студэнцкага калектыву? У першую чаргу студэнты самі наладжваюць новыя сувязі, аб'ядноўваюцца на аснове вучэбных і навуковых інтарэсаў, знаходзяць агульныя справы. Камсамольская арганізацыя факультэта і дэканат прымаюць у гэтым самы актыўны ўдзел. Агульнафакультэцкія мерапрыемствы, работа камсоргаў і стараст груп, кантроль за паспяховасцю з боку дэканата — усё гэта, несумненна, дапамагае групе стаць калектывам. Хачу спыніцца на ролі кафедры ў гэтай справе.

Кафедра прадастаўляе студэнтам шырокія магчымасці для навуковай работы. Узнікаюць «рабочыя» групы па двачтры чалавекі, якія распрацоўваюць адну тэму. На трэцім—пятым курсах на нашай кафедры вышэйшай алгебры чытаюцца адзінаццаць спецкурсаў і спецсемінараў. Прычым частку з іх вядуць супрацоўнікі Інстытута матэматыкі АН БССР. Праблемнае выкладанне матэрыялу, атмасфера дыскусіі, сур'ёзнасць спецсемінараў — гэта нікога не пакідае абыякавым, садзейнічае аб'яднанню на самай важнай аснове — аснове сумеснай работы. Сапраўдны калектыў студэнтаў — калектыў аднадумцаў. І таму навука з'яўляецца дзейсным каталізатарам новага калектыву.

Справа, якая аб'ядноўвае нас усіх, асабліва ярка бачна на традыцыйных студэнцкіх навуковых канферэнцыях. Яны праводзяцца ў Дні мехмата і становяцца сапраўднымі аглядамі студэнцкай навуковай думкі, паказваюць ступень падрыхтаванасці і творчыя імкненні будучых матэматыкаў. Ад нашай шостай групы ў мінулым годзе на канферэнцыі было прадстаўлена некалькі змястоўных дакладаў, з якімі выступілі студэнты А. Вялеська, І. Вярановіч, Б. Дзяхцяр. Даклады іх былі адзначаны СНТ факультэта.

Усё гэта сведчыць аб росце творчай ініцыятывы студэнтаў у групах. Таму, мне здаецца, трэба шырэй прыцягваць будучых матэматыкаў да сур'ёзных прыкладных даследаванняў. Зразумела, гэта турботна і не заўсёды эфектыўна ў сэнсе вынікаў, але іменна навуковая работа, асэнсаванне яе неабходнасці дапамагае нам, студэнтам, глыбей і лепш падрыхтавацца да самастойных даследаванняў.

Першыя навыкі самастойнай працы мы атрымліваем, калі пішам курсавыя на другім курсе. Адбываецца папярэдняе размеркаванне студэнтаў па кафедрах: скажам, сёмая група — на кафедру геаметрыі, пятая — на кафедру матэматычнай логікі і г. д. Але наўрад ці дапамагае студэнту такое абавязковае «замацаванне» вызначыць свае схільнасці, зразумець, чым ён жадае займацца. Відаць, лепш было ўвесці самастойны выбар тэмы курсавой работы. Гэта павысіла б якасць работы, дапамагло камусьці яшчэ на другім курсе «знайсці сябе».

Пажадана ўвесці ў практыку сумесныя курсавыя для двух ці некалькіх чалавек. Гэта дазволіць працаваць над больш складанымі тэмамі, павысіць адказнасць, будзе садзейнічаць аб'яднанню «малых груп», якія і ёсць першаснова калектыву.

**Ю. ДРАКАХРУСТ,**
**студэнт IV курса мехмата.**

# Далучэнне да подзвігу

У канцы мінулага месяца ў БДУ імя У. І. Леніна адбылася літаратурная канферэнцыя, арганізаваная універсітэцкай бібліятэкай, дэканатам і партбюро геаграфічнага факультэта па кнізе І. А. Ласкіна «На пути к перелому».

Дацэнт У. С. Карабан, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, студэнты універсітэта, якія выступілі на канферэнцыі, падкрэслілі вялікае значэнне ваенна-мемуарнай літаратуры ў справе ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі. Перад шматлікай студэнцкай і выкладчыцкай аўдыторыяй выступіў аўтар мемуараў, які, спыніўшыся на некаторых эпізодах са сваёй гераічнай біяграфіі, расказаў аб гістарычных подзвігах і бяспрыкладнай мужнасці Севастопаля і Сталінграда, пажадаў маладому пакаленню быць вернымі подзвігам бацькоў, заставацца дастойнымі патрыётамі-інтэрнацыяналістамі сваёй вялікай Савецкай Радзімы.

На канферэнцыі была арганізавана кніжная выстаўка.

**А. РУКШЫН,**
**загадчык аддзела абслугоўвання бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна.**

ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА

# «НА ПАДВОДНЫХ КРЫЛАХ»

**У матэрыяле з такой назвай, змешчаным у газеце [№ 29] ад 6 лістапада 1980 года, крытыкавалася слабая работа прафсаюзнага бюро факультэта прыкладной матэматыкі. Рэдакцыя атрымала рэагаванне:**

«Факты, якія былі прыведзены ў артыкуле «На падводных крылах»,—у асноўным правільныя.

На некаторыя з памылак, якія дапускаліся ў працэсе работы былога студэнцкага прафбюро і яго старшыні В. Нічыпарука, указвалася дэканатам факультэта і партбюро яшчэ задоўга да канферэнцыі. Аднак становішча спраў так і не змянілася. Прычыны розныя. Асноўная ж была ў тым, што (як і гаварылася ў артыкуле) В. Нічыпарук імкнуўся ўсе пытанні вырашаць асабіста, нават не раячыся з членамі прафбюро, якія практычна не мелі магчымасці праявіць самастойнасць у сваёй рабоце. Праўда, трэба дадаць, што з боку асобных камісій, якія ўваходзілі ў састаў прафбюро, не назіралася ініцыятывы, каб змяніць існуючае становішча. Усё гэта прывяло да тых памылак, якія ўказаны ў артыкуле.

Дэканатам факультэта, партыйным бюро неаднаразова абмяркоўвалася работа прафбюро. На адным з пасяджэнняў прафбюро яго членам было ўказана на парушэнні пры вырашэнні тых ці іншых пытанняў, якія датычаць работы жыллёва-бытавой камісіі.

На канферэнцыі выбраны новы састаў прафбюро. У сувязі з вышэйсказаным прафбюро абноўлена больш чым напалавіну. На сваім першым рабочым пасяджэнні прафбюро абмеркавала выступленне газеты і прыняло рашэнне, у якім ёсць, у прыватнасці, і пункты, якія датычаць тых пытанняў, аб якіх гаворыцца ў артыкуле.

Новае прафбюро пачало работу даволі актыўна. Дэканат, партбюро факультэта ўзмацнілі кантроль за работай грамадскіх арганізацый і спадзяюцца, што прафбюро не паўторыць тых памылак, якія былі дапушчаны ў мінулым годзе, і, зразумела, не зробіць новых».

**В. КАРЗЮК,**
**в. а. дэкана факультэта прыкладной матэматыкі,**
**В. КРАСНАПРОШЫН,**
**сакратар партбюро,**
**В. ГАЙДЫШ,**
**старшыня прафбюро.**

# КЛОПАТЫ КОЖНАГА ДНЯ

ФОТАРЭПАРТАЖ

**[Працяг. Пачатак на 1-й стар.].**
талаўкладанняў на аб'ектах Беларусі, Малдавіі, Карэліі, Пскоўшчыны. Са студэнцкім Знакам якасці здадзены тры аб'екты, у Фонд міру пералічана 3.258 рублёў...

Факультэт жыве ўжо сённяшнім. Сярод надзённых праблем—арганізацыя вольнага часу. Як зрабіць жыццё цікавейшым? Пошук талентаў — гэта яшчэ не ўсё. Ва універсітэцкім аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці — дзевятае месца. Ім хочацца адвергнуць думку, што калі выступае юрфак, дык гэта нудна. І не словам, а на справе пацвердзіць. Спробы на творчую самастойнасць ёсць, і даволі сур'ёзныя.

Пасля гарачай дыскусіі
**[Заканчэнне на 3-й стар.].**





# КЛОПАТЫ КОЖНАГА ДНЯ

ФОТАРЭПАРТАЖ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.].

ў кастрычніку гэтага года адкрыўся студэнцкі клуб факультэта. Яму наканавана роля не толькі «пад'ёму» мастацкай самадзейнасці, але і ініцыятара цікавых задум і конкурсаў, дыскатэк. Фотаслайд-клуб ужо зараз аб'ядноўвае 170 чалавек. Даволі ўдала пачалі дзейнічаць клуб літаратуры і паэзіі, гурток жывапісу і чаканкі.

Заходзім у клуб. Уладзімір Стужук разам з Валерыем Шаўчэнкам і Юрай Лебедзевым рыхтуюцца да чарговай рэпетыцыі. У хлопцаў ёсць свае дасягненні, як, напрыклад, першае месца ў аглядзе ВІА.





Заглянем у аўдыторыі. Лекцыю па крымінальнаму працэсу чытае дацэнт В. М. Шпілёў, а ў наступнай аўдыторыі вядзе семінар па гісторыі дзяржавы і права дацэнт В. В. Сарокіна. Сярод тых, хто дапамагае студэнтам спасцігнуць складанасць юрыдычных навук—прафесары В. Ф. Чыгір, І. І. Гарэлік, доктар юрыдычных навук М. Т. Юркевіч, дацэнт І. А. Юхо і многія іншыя. Амаль з першых дзён заснавання юрыдычнага факультэта, з 1923 года, выкладае Ф. І. Каўэз. Ён расказвае часам і аб тых першых «дзіцячых» гадах факультэта, пра багатыя традыцыі. Большасць юрыстаў, якія працуюць у рэспубліцы,— выпускнікі нашага юрфака. Вучоныя факультэта выдалі дзесяткі манаграфій, вучэбных дапаможнікаў. Ахоплена навуковай работай амаль палова студэнтаў факультэта.

Не заўважаеш, што за акном пачынае цямнець. Час праляцеў зусім непрыкметна. Спускаемся ўніз. Міжволі звяртаем увагу на мемарыяльную дошку ў фае. Даніна памяці выкладчыкам і студэнтам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Але ёсць яшчэ і невядомыя імёны. Група «Пошук» на чале з прафесарам І. І. Гарэлікам працягвае работу.

У вокнах гарыць святло, жыццё на факультэце не заціхае. Праз некалькі дзён — вечар працоўнай славы, пачынаецца падрыхтоўка да навагодніх свят... Турботы і клопаты. І так кожны дзень, звычайны і незвычайны.

**М. ЛАХВІЧ.**

Фота **М. Дубовіка і В. Маскалёва.**




---

● **КАНФЕРЭНЦЫЯ**

## Этыка настаўніка

У развітым сацыялістычным грамадстве планамерная і паўсядзённая работа школы, задачы навучання і выхавання падрастаючага пакалення, якія яна выконвае, набываюць усё большую грамадскую вагу, аказваюць узрастаючы ўплыў на розныя бакі жыцця. Школа для вучня — гэта перш за ўсё настаўнік. Яго дзеянні, адносіны да прадмета і людзей выступаюць для дзяцей як рэальны маральны ідэал, па ўзору якіх будуюцца іх паводзіны.

Ролі дзейнасці настаўніка, яго паводзінам у працэсе вучэбна-выхаваўчай работы, вынікам педагагічнай практыкі студэнтаў была прысвечана канферэнцыя «Этыка і культура паводзін настаўніка», якая прайшла на хімічным факультэце.

На канферэнцыі прымалі ўдзел студэнты V курса, прадстаўнікі кафедры педагогікі, метадысты, настаўнікі школ.

Студэнты выступілі з дакладамі: «Роля маральнай дзейнасці настаўніка (Наталля Самаль, Ніна Каўтунова), «Асоба настаўніка ў вучэбна-выхаваўчым працэсе» (Ларыса Старушэнка), «Маральныя адносіны ў працэсе вучэбна-выхаваўчай работы ў школе» (Таццяна Баханко), «Маральная свядомасць настаўніка» (Ірына Карабейнік, Наталля Сінкевіч) і інш.

Студэнты па-дзелавому, грунтоўна абмеркавалі пытанні аб ролі асобы настаўніка ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. З вялікім інтарэсам былі ўспрыняты выступленні настаўнікаў мінскіх школ.

Важнае месца на канферэнцыі заняла размова аб канкрэтных мерапрыемствах па паляпшэнню падрыхтоўкі настаўнікаў на факультэце, правядзенню педпрактыкі.

**Д. МЫЧКО,**
**старшыня вучэбна-выхаваўчай камісіі камітэта камсамола хімічнага факультэта.**

---

ВОДГУКІ ЧЫТАЧОЎ НА «РЭПАРТАЖ З АПОШНЯЙ ПАРТЫ»

## Лекцыям—эфектыўнасць і якасць

20 ЛІСТАПАДА «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» АПУБЛІКАВАЎ МАТЭРЫЯЛ «ЦІ ВЕЧНЫ «ШЧАСЛІВЫ БІЛЕТ?», У ЯКІМ УЗНІМАЕЦЦА ПРАБЛЕМА ЭФЕКТЫЎНАГА ВЫКАРЫСТАННЯ ЛЕКЦЫЙНАГА ЧАСУ. «РЭПАРТАЖ З АПОШНЯЙ ПАРТЫ» ВЫКЛІКАЎ ЦІКАВАСЦЬ У ЧЫТАЧОЎ, ЗАКЛАПОЧАНАСЦЬ. АБ ГЭТЫМ СВЕДЧАЦЬ ВОДГУКІ, ЯКІЯ АТРЫМАЛА РЭДАКЦЫЯ. СЁННЯ МЫ ЗМЯШЧАЕМ НЕКАТОРЫЯ З ІХ.

**Н. Кашавая, В. Пацкевіч, студэнткі III курса хімічнага факультэта:**

— Прачытаўшы «Рэпартаж з апошняй парты», адразу ж успамінаеш, што на некаторых лекцыях і ў нас так здараецца. Часам сядзіш на лекцыі, здаецца — усё зразумела, а потым прапусціш адну-другую думку выкладчыка, і ўвесь астатні час пойдзе марна.

Каб усё было зразумела і цікава, трэба ўважліва слухаць. Але не заўсёды так атрымліваецца: не кожны выкладчык можа валодаць студэнцкай аўдыторыяй на працягу ўсёй лекцыі. І як прыемна, калі выкладчык і студэнт зразумелі адзін аднаго, не згубілі дарэмна лекцыйны час. Прыкладам з'яўляецца курс лекцый па хіміі высокамалекулярных злучэнняў, які чытае Г. М. Паўлючэнка. На гэтай лекцыі сапраўды працуеш творча разам з выкладчыкам.

**Ігар Папельскі, студэнт III курса геаграфічнага факультэта:**

— Мяркую, што з павагай і сур'ёзнасцю адносішся да прадмета тады, калі выкладчык патрабавальны (любіць дысцыпліну).

**Алена Ліпа, студэнтка II курса механіка-матэматычнага факультэта:**

— Ведаеце, здараецца так, што слухаць сапраўды не хочацца. Але бывае, што пропуск хаця б і адной лекцыі робіцца трагедыяй для самога сябе. Да прыкладу — філасофія. У нас яе слухаюць з вялікім захапленнем. Старшы выкладчык І. М. Марозаў так цікава расказвае, прыводзіць такія жыццёвыя прыклады, што нават і думкі не паяўляецца займацца чым-небудзь іншым у час яго заняткаў.

**Валерый Гайко, студэнт IV курса механіка-матэматычнага факультэта:**

— Пытанне закранута сур'ёзнае, і адказаць на яго аднабакова нельга. Па-першае, адносіны да лекцый залежаць ад сур'ёзнасці і мэтанакіраванасці самога студэнта. Нават калі выкладчык на лекцыі гаворыць незразумела, потым гэтыя «белыя плямы» можна дапрацаваць і самастойна. Галоўнае — была б асабістая зацікаўленасць. А з другога боку — шмат залежыць ад выкладчыка.

Прывяду прыклад. Лекцыі па аналітычнай геаметрыі і лінейнай алгебры доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара А. С. Фядэнкі ў нас праходзяць вельмі цікава. Напружанасць і дынамічнасць лекцыі дасягаецца ў выніку непарыўнай сувязі выкладчыка з аўдыторыяй.

## ЯК ЖЫВЕШ, ГАЛЁРКА?

Студэнт выбірае месца ў аўдыторыі. Гэта нагадвае імкненне пасажыраў як найхутчэй прасунуцца да дзвярэй аўтобуса або ўсесціся зручней. Калідорны рух паміж лекцыямі незвычайна імпэтны, разлічаны на апярэджванне. І ўсё звязана з «захопамі» галёркі.

Галёрка студэнту многае абяцае, многае забяспечвае. Уладкуецца сабе такі «слухач» і за лекцыю падрыхтуецца да практычных ці семінарскіх, прачытае шмат старонак мастацкага твора, возьмецца за красворд, а то і проста паплыве-паляціць у думках на край свету, і на чысцюткай старонцы канспекта лягуць роздумныя паэтычныя радкі. Такіх «творчых» студэнтаў на курсе мы добра ведаем. І радуемся, калі на перапынку нам чытаюцца самыя свежыя радкі, калі выкладчыцкі голас і манеры ўзнаўляюцца рэдкім талентам студэнта-парадыста. Вось вам і галёрка. Былі ў нас на журфаку паэты, былыя выпускнікі, хваліліся, як ім на галёрцы ўдавалася ствараць амаль што хрэстаматыйныя творы. Чыталі іх, а мы зайздросцілі. Можа таму, галёрка, ты так прыцягваеш да сябе?

Бывае і так, што выкладчык нават пабойваецца галёркі: там успыхваюць спрэчкі, там часцей падымаецца рука—чакай тупіковых пытанняў ці бунтоўную рэпліку. У аўдыторыі тады зацятая цішыня, аўдыторыя слухае «голас з галёркі». Ён запаўняе выкладчыкаў паўзы самастойнымі разважаннямі, жывым словам і дыскусійным дыялогам. Іншы выкладчык не дасць спакою ні на хвіліну, асабліва на практычных занятках. Тут няма галёркі, ён хоць дзе знойдзе цябе, як ні хавайся за спіны таварышаў.

Можна сядзець і на галёрцы, але і там увага да лекцыі не прападае, калі ўважліва сочыш за кожным словам, запісваеш асноўнае і... сказы, у якіх лектар парушыў лагічнасць думкі, «заблытаўся ў складаных перыядах». Культура мовы не толькі па падручніках вывучаецца. А калі хутка траціш увагу, то тут і галёрка ні пры чым, уся аўдыторыя можа адплыць у летуценнях. Можна толькі пашкадаваць, што мы не ўмеем слухаць. Відаць, і гэтаму трэба вучыцца.

Галёрка найчасцей збірае тых, хто не мае што сказаць па тэме семінарскіх. Аднак не ў галёрцы справа. Студэнт можа выспацца і ў першых радах, можа зачытацца раманам перад самым носам выкладчыка. Бо ён ведае—выкладчык пасе галёрку, адтуль чакае «непрыемнасцей», а тут абы ціха было. Самастойна потым усё зразумець ці вывучыць немагчыма. Не пачутае, не запісанае трэба будзе потым знайсці, на пошукі патраціць час. Не думайце, што на галёрцы растуць паэты, шахматысты, мастакі. Галёрка найчасцей дае гаротнікаў, якім у час сесіі даводзіцца асвойваць чужыя канспекты, шукаць узыхаць і абзацы сабе: «Вось у наступным семестры...»

**М. РЫГОРАЎ,**
**выкладчык.**

# Ружовы ранак

літаратурная старонка

## Прага шчырае споведзі

Я з глыбокім хваляваннем прачытаў гэтае прызнанне першакурсніцы:

А прага шчырае споведзі
Хвалюе, падступае...

Бо калі ёсць гэткая прага, ёсць ужо тое, з чаго пачынаецца паэзія — паэзія як споведзь сэрца, як вялікая адвага сказаць усім пра сябе, пра сваё, ды сказаць так, каб тваё стала ўсіхным, каб усіх захвалявала — адбіла хваляванні ўсіх людзей — тваіх сучаснікаў, твой час.

Абрадавала на першым пасяджэнні нашага літаб'яднання «Узлёт» і тое, што зноў не адзін-два, а даволі людная шарэнга першакурснікаў прыйшла на яго з той жа прагай споведзі, што і Алена Парфеянец. Што гэта так, вас пераканаюць і вершы двух Сяргееў — Чыгрына і Кавалёва, дзвюх Таццян — Каваленкі і Марчык, Леаніда Трубача, Ганны Вязіцкай і інш. «Добрай раніцы!» — гэтымі словамі вітаюць свет, сваю раніцу — маладосць, свае першыя дні ва універсітэце нашы сённяшнія дэбютанты — першакурснікі філфака. «Добрай раніцы! — скажам жа і ім.—У добры час!..»

**А. ЛОЙКА,**
**кіраўнік літаб'яднання «Узлёт».**

**Алена ПАРФЕЯНЕЦ**

### ДОБРАЙ РАНІЦЫ!

Сонца вочы адкрыла светлыя
І вітаецца
З небам сінім, травамі,
вербамі:
— Добрай раніцы!
Каласкам штосьці шэпча
вецер,
Прачынаюцца
І гавораць цэламу свету:
— Добрай раніцы!
Дзень, напоўнены цудамі
рознымі,
Пачынаецца.
Ціха кветкі вызваньваюць
росамі:
— Добрай раніцы.

Хаты, так на людзей падобныя,
Адчыняюцца.
— Добрай раніцы,
людзі добрыя!
Добрай раніцы!..

### У ГЭТЫМ ВЯЛІКІМ ГОРАДЗЕ

У гэтым вялікім горадзе
Столькі позіркаў ясных,
Ды не знайду (вось гора дзе!)
Між іх я самы нязгасны.
Усмешкі цвітуць пралескамі,
Раптоўна, як знічкі, знікаюць,
А я між іх самую веснюю —
Тваю ўсмешку шукаю.
А прага шчырае споведзі
Хвалюе, падступае,—
У гэтым вялікім горадзе
Мне так цябе не хапае.

### СЭРЦА

Узыходзіць сонца над светам.
Ціхай радасцю б'ецца
Найтаемнейшая планета —
Чалавечае сэрца.



Зіма прыйшла... Фотаэцюд **С. Болдзіна.**

**Вольга САВАСЦЮК**

### ЧАСЦІНКА РОДНАЯ ТВАЯ...

Блакіт нябёс і сінія азёры,
І васількі, што шэпчуцца
ў палях,
І рэкі, што нясуць свой скарб
да мора,—
Усё Радзіма — родная зямля.
Твой светлы гай і белы сад
вішнёвы
З дзяцінства мне запалі ў душу.
Твой сімвал працы — каласок
жытнёвы,
Як талісман, пры сэрцы я нашу.
Куды б мяне суровы лёс
ні кінуў,
Вер, Беларусь, з табой
заўсёды я.
Цябе, зямля, ніколі не пакіну,
Бо я — часцінка родная твая!..

**Таццяна КАВАЛЕНКА**

### Я ТАДЫ ТОЛЬКІ БУДУ ШЧАСЛІВАЙ...

Я тады толькі буду шчаслівай,
Калі нашу зямлю абыду,
Утаймую прылівы, адлівы,
У пустыні ваду правяду,
Новы горад збудую прыгожы,
Ад хвароб вас пазбаўлю і бед,
У сусвет уздымуся і, можа,
На Венеры пакіну свой след.
Ды зраблю адкрыццё нечакана,
Шмат складу новых песень і
кніг,
На палях папрацую аддана
І лясоў насаджаю сваіх,
Калі будуць са мной
выхаванцы,—
Частка сэрца і зясна мая...
Каб шчаслівай пад сонцам
назвацца,
Стаць настаўніцай думаю я.

**Сяргей ЧЫГРЫН**

### ДОЧКІ СОПАК — АКАЦЫІ

Дочкі сопак — акацыі
Вітаюць заранку,
Б'юць гвардзейскія гаўбіцы
Па макетах танкаў.
У пяску мазніцы,
Запацелы твар.
З біклагаў вадзіца,
Як вар...
Новая заранка,
Мірна чырваней!..
Сёння сланімчанка
Зноў прысніцца мне.

* * *

Мая палахлівая Шчара
Бяжыць між лугоў напрасткі,
У хвалях купаюцца хмары,
Пад сонцам пяюць жаўрукі.
Вербы-фігляркі прычоскі
Палошчуць у чыстай вадзе,—
Не я, хтосьці іншы з вёскі
Па беразе коней вядзе.

**Таццяна МАРЧЫК**

### САЛАВЕЙ

І сэрца—насцеж... Надвячоркам
росным
Прыйдзі на луг паслухаць
салаўя:
У спеве тым — задумлівы шум
соснаў
І гоман веснавога ручая.
Чаго таіць — цяжкі бывае
смутак,
Яго аднойчы стрэнеш ты і я...
На схіле зжураных туманных
сутак
Прыйдзі на луг паслухаць
салаўя.

**Ганна ВЯЗІЦКАЯ**

* * *

Мне з маленства ўсё тут
знаёма:
Панадворачак, сад, агарод...
Пахне лісцем, зямлёй і
саломай
Каля нашых прыціхлых варот.
Каля нашай заснулае хаты
Задрамаў маладзенькі каштан,
Да падмурачка туліцца мята,
Бо чарнее на плоце саган.

**Алена ЗАБАРОНАК**

* * *

Мне доўга так стаяць,
Вачэй не апускаючы,
Глядзець, як дрэвы спяць,
Ледзь чутна снег страсаючы.
І раптам крок зраблю
Ў заснежаную казку я:
— Даруй,— скажу,— люблю
Пяшчоту, ціш і ласку я...
А лес будзе маўчаць
(Прыйшла з якое далечы?),
Ледзь чутна снег страсаць,
Завеі ўспамінаючы.

**Леанід ТРУБАЧ**

* * *

Усё. Зарніцай адмільгалі дні,
І восень лісце пазрывала
з дрэў.
І больш цябе я ўжо не сніў,
Мяне твой погляд больш
не грэў.
Я цёплы ветрык здаля
сустракаю:
Мо ад цябе ён вестку
прынясе?..
А ноччу шчырай, па-над ціхім
гаем
Губляе неба зоркі пакрысе.

## МІШЭНІ ЗАСТАЮЦЦА ЧЫСТЫМІ

*Увага: прыміце меры!*

ДВА ДНІ Ў ПАМЯШКАННІ універсітэцкага ціра працягваліся спаборніцтвы па кулявой стральбе. Праграмай прадугледжваліся толькі два практыкаванні: 10 выстралаў з вінтоўкі на 25 метраў (МВ-І) і 10 выстралаў з пісталета на 25 метраў (МП-І). 116 спартсменаў з адзінаццаці факультэтаў універсітэта вялі барацьбу за права быць мацнейшымі ў камандным і асабістым заліку.

Арганізатары спаборніцтваў галоўнай сваёй мэтай ставілі папулярызацыю стралковага спорту ва універсітэце і падрыхтоўку спартсменаў-разраднікаў.

Як ім удалося гэта, мяркуйце самі. Вось як выглядае, напрыклад, табліца каманднага першынства (у дужках — агульная колькасць ачкоў па суме двух практыкаванняў):

1. Хімічны факультэт (163,3)
2. Факультэт радыёфізікі і электронікі (160,5)
3. Фізічны факультэт (158,1)
4. Гістарычны факультэт (154,9)
5. Геаграфічны факультэт (149,7)
6. Біялагічны факультэт (140,5)
7. Механіка-матэматычны факультэт (133,2)
8. Факультэт прыкладной матэматыкі (120,6)
9. Філалагічны факультэт (105,5)
10. Факультэт журналістыкі (60,7)
11. Юрыдычны факультэт (0).

Першае месца каманды хімічнага факультэта не з'явілася нечаканасцю. З году ў год хімікі знаходзяцца ў ліку лідэраў ва універсітэце. І гэта заканамерна. Тут створана моцная секцыя, у якой рэгулярна праводзяцца заняткі пад кіраўніцтвам вопытных настаўнікаў. На гэтых спаборніцтвах стралкі хімфака выступілі роўна і не пакінулі сваім сапернікам ніякіх шансаў на поспех у барацьбе за агульнакаманднае першынство.

Вялікай сенсацыяй турніра з'явілася другое месца стралкоў радыёфізічнага факультэта, якія дагэтуль нават не ўваходзілі ў групу мацнейшых. «Бронза» дасталася фізікам.

Бясспрэчна, пераможцы заслугоўваюць добрых слоў. Але тут не можа не ўзнікнуць пытанне: «У якім стане знаходзіцца сёння гэты від спорту ва універсітэце»? Возьмем, напрыклад, каманду хімічнага факультэта. Ніхто з яе ўдзельнікаў так і не змог выканаць трэцяга разраду. У камандзе радыёфізікаў гэтага «рубяжу» дасягнуў толькі А. Голуб у практыкаванні МП-І (91 ачко). У практыкаванні МВ-І добрых вынікаў дабіліся С. Маршалка (фізфак) — 99 ачкоў, В. Дубінец (фізфак) — 98 ачкоў, А. Гарэлікава і Н. Давідовіч (біяфак) — 96 ачкоў. Усяго ж нарматывы другога і трэцяга разрадаў выканалі толькі 6 чалавек. Як бачна, каментарыі напрошваюцца сумныя.

Па раскладу кафедры фізічнага выхавання і спорту зборная каманда універсітэта павінна праводзіць трэніроўкі ў ціры кожны аўторак з 16 да 18 гадзін вечара, але ў гэты час там нікога няма, таму што зборная існуе на паперы. З адзінаццаці факультэцкіх секцый толькі нямногія праводзяць рэгулярныя заняткі. Ды і кіруюць імі грамадскія інструктары з ліку студэнтаў, многія з якіх самі не маюць дастатковых навыкаў па кулявой стральбе. Рэдкімі гасцямі ў ціры сталі выкладчыкі фізічнага выхавання на факультэтах. Адзіным кансультантам і настаўнікам там з'яўляецца начальнік ціра М. А. Насонаў. Пры такім падыходзе да справы цяжка разлічваць на добрую падрыхтоўку спартсменаў-разраднікаў і павышэнне папулярнасці кулявой стральбы сярод студэнтаў. Увогуле, аб якой папулярнасці можа весціся гаворка, калі на спаборніцтвы поўнасцю не з'явілася каманда юрфака і амаль палова каманды факультэта журналістыкі. У сувязі з гэтым мне ўспамінаецца сумны жарт сакратара спаборніцтваў П. Р. Барышэўскага: «Няма гора без дабра: хоць мішэні застануцца чыстымі»...

**У. КАПСКІ.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
4 снежня 1980 г.

Заказ 1802 АТ 19546

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 22-07-19.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ